# АКАЗІЯНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ЯК КАМПАНЕНТ БЕЛАРУСКАГА АБРАДАВАГА КОМПЛЕКСУ

М. А. Шатарава, кандыдат філалагічных навук
УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”,
Рэспубліка Беларусь

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца месца і роля аказіянальнай абраднасці як кампаненту беларускага абрадавага комплексу, класіфікацыя беларускай абраднасці на падставе вызначэння аб’екту, часу правядзення і функцыянальнай накіраванасці абрадавага дзеяння, выяўляецца ўзаемаўплыў розных тыпаў абраднасці і асаблівасці набыцця аказіянальнымі абрадамі якасных характарыстык іншых груп.

Ключавыя словы: аказіянальная абраднасць, беларускі абрадавы комплекс, класіфікацыя абраднасці, крызісная сітуацыя, традыцыйнае грамадства.

# OCCASIONAL RITUALITY AS A COMPONENT OF THE BELARUSIAN RITUAL COMPLEX

M. A. Shatarava, Candidate of Philological Sciences
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,
Republic of Belarus

Abstract. The article examines the place and role of occasional ritual as a component of the Belarusian ritual complex, the classification of Belarusian ritual based on the definition of the object, time of performance and functional orientation of the ritual action, reveals the mutual influence of different types of ritual and the peculiarities of the acquisition of qualitative characteristics of other groups by occasional rituals.

Keywords: occasional ritual, Belarusian ritual complex, classification of ritual, crisis situation, traditional society.

Для гістарычнага развіцця чалавецтва характэрна тое, што вераванні, маральна-этычныя нормы, правілы, погляды, спосабы вядзення гаспадаркі, якія б забяспечвалі дабрабыт кожнага чалавека і грамадства ў цэлым, назапашваліся ў пэўную сістэму, фарміруючы сацыяльны вопыт, перадаваліся з пакалення ў пакаленне і ўсведамляліся як неабходныя на ўзроўні грамадскай свядомасці. Гэтая сістэма ўяўляла сабой сукупнасць дзеянняў, слоў, рухаў, магічных сімвалаў, знакавых элементаў, якія схематычна адлюстроўвалі вераванні чалавека і ажыццяўляліся паводле формульнага прынцыпу. Усё гэта на ўзроўні падсвядомага павінна было садзейнічаць дабрабыту чалавека, што абумоўлівала канстантнасць выканання і забяспечвала ўстойлівае захаванне і пераемнасць зместу, характару, форм пэўных працэсаў і з’яў асабістага і грамадскага жыцця.

Абрад уяўляе сабой сістэму норм паводзін, што ахоплівалі ўсе сферы жыцця і ўяўлялі сабой выкананне сімвалічна-знакавых дзеянняў і вербальных тэкстаў, якія былі абумоўлены традыцыяй. У народным уяўленні абрады ўяўлялі сабой сінкрэтычнае адзінства слоў, рухаў, песень, дзеянняў з прадметамі і г. д. Аднак кожны абрадавы элемент утрымліваў у сабе сваю асабістую накіраванасць, якая была падпарадкавана агульнай мэце, вызначаўся пэўнымі асаблівасцямі і патрабаваннямі ў якасных і колькасных характарыстыках. У складзе абраду можна выдзеліць вызначаныя сімвалічныя дзеянні, якія маюць найбольш архаічную форму або значэнне і, у некаторых выпадках, храналагічна папярэднічаюць абраду. Абрад складаецца з асобных рытуалаў, што ўяўляюць сабой замацаваную традыцыяй паслядоўнасць сімвалічна значных дзеянняў. Такім чынам, рытуал у складзе абраду з'яўляецца сістэмай звыклых сімвалічных дзеянняў, што паўтараюцца і арганізаваны ў адпаведнасці з пэўным парадкам. А. В. Цітавец вызначае адрозненне тэрмінаў "абрад" і "рытуал" наступным чынам: "Абрад – гэта актыўны вопыт многіх пакаленняў і сукупны вопыт (веды) усіх удзельнікаў. Рытуал – гэта таксама вопыт (веды), але дыферэнцыраваны. І дыферэнцыяцыя тут адбываецца па розных напрамках і ўзроўнях" [1, с. 446].

Абрадавы комплекс беларускага народа ўяўляе сабой сістэму абрадаў і звычаяў, якія рэгулявалі жыццё чалавека і ў якіх увасоблена яго светаўяўленне. Асновай жыццядзейнасці чалавека з'яўлялася аграрная гаспадарка, "вакол якой склалася разгалінаваная і зладжаная сістэма народных ведаў, працоўных навыкаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, павер'яў, сімвалічных дзеянняў і інш." [2, с. 3]. Вялікае значэнне мела захаванне і перадача ад пакалення да пакалення працоўных і бытавых ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама звычаяў, абрадаў, сімволіка-знакавых дзеянняў, павер'яў, звязаных з асноўнымі жыццёвымі сферамі: сям'ёй, працай, узаемаадносінамі з іншымі членамі грамадства.

Сістэматызацыя беларускіх абрадаў (а таксама рытуалаў і звычаяў у іх складзе) садзейнічае больш глыбокаму вывучэнню чалавечага вопыту, захаванага ў традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў. Класіфікацыя беларускай абраднасці можа быць праведзена на падставе разнастайных фактараў, але найбольш цэласным з'яўляецца выдзяленне абрадавых тыпаў па наступных аспектах: аб'ект, час правядзення і функцыянальная накіраванасць абрадавага дзеяння. Асаблівасці дадзеных фактараў у характарыстыкі канкрэтных абрадаў дазваляюць вылучыць іх асноўныя тыпы: каляндарная, сямейная і аказіянальная абраднасць.

Каляндарныя – абрады, якія ўяўляюць сабой наладжаную сістэму народных ведаў, звычаяў, сімвалічных дзеянняў і рытуалаў і заснаваны на гадавым народным календары, на вызначанай сістэме "свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзён забарон, што замацаваны ў быце і фальклоры беларусаў праз спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх кампанентаў і з'яўляюцца арыенцірам пры

выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынкаў у гадавым, сезонным, месячным цыклах” [3, с. 20–21]. Каляндарныя абрады звязаны з гаспадарча-бытавой сферай, магічна-інтымнай, а таксама з вузкапрафесійнымі, але не земляробчымі заняткамі.

Сямейныя абрады вызначаюць асноўныя жыццёвыя цыклы, звязаныя з пэўнай зменай сацыяльнага статуса ў традыцыйным грамадстве. Самыя вызначальныя этапы ў жыцці чалавека суправаджаліся працяглымі рытуаламі, накіраванымі на “захаванне і працяг роду, паляпшэнне дабрабыту, ушанаванне продкаў, забеспячэнне перамогі добрых духаў” [4, с. 364].

Сямейныя абрады ўключаюць у сябе радзінную, вясельную, пахавальную і памінальную віды абраднасці. Аб’ектам рытуальных дзеянняў у такіх абрадах з’яўляецца чалавек, які ў сваім сацыяльным статусе знаходзіцца на “памежжы”. Пры гэтым асноўнай мэтай з’яўляецца пераход у новы жыццёвы этап, змяненне сацыяльнай ролі ў грамадстве. Таму часавыя абмежаванні сямейнай абраднасці абумоўлены жыццёвым рытмам і звязаны з выкананнем абрадавых дзеянняў па прычыне дасягнення пераходнага стану. Правядзенне такіх абрадаў забяспечвае змяненне сацыяльнага статуса чалавека, напрыклад, у вясельнай абраднасці – маладыя становяцца мужам і жонкай, у памінальнай – нябожчык пераходзіць у статус продкаў і г. д. У гэтым выяўляецца функцыянальная накіраванасць сямейна-бытавой абраднасці, звязанай з забеспячэннем жыццядзейнасці кожнай сям’і і грамадства ў цэлым.

Найбольш архаічнай з’яўляецца аказіянальная абраднасць, што ўяўляе сабой абрадавыя дзеянні з атрыбутамі і вербальныя тэксты, якія праводзяцца не рэгулярна, а пры неабходнасці, звязанай з крызіснымі сітуацыямі ў жыцці чалавека. Гэты тып абраднасці цесна звязаны з магічнымі ўяўленнямі, характарызуецца асаблівым складам удзельнікаў, выбарам рытуальных прадметаў, калектыўным узаемадзеяннем з мэтай кансалідацыі сіл на барацьбу са звышнатуральнымі сіламі. Аб’ектам правядзення аказіянальных абрадаў з’яўляюцца так званыя іншыя сілы – сілы прыроды (надвор’е, стыхіі), злыя духі і нячысцікі, якія ўяўлялі сабой “іншы свет”, “чужы”, прадстаўнікі якога выклікалі крызісы і парушэнні звыклага ладу жыцця. Час правядзення аказіянальнай абраднасці быў звязаны з непасрэднай крытычнай сітуацыяй, якая яго выклікала. Абрадавыя дзеянні праводзіліся пасля крызісу з мэтай яго спынення (ачышчальная функцыя) або загадзя з мэтай яго недапушчэння, своеасаблівай прафілактыкі (ахоўная функцыя). Пры гэтым асаблівае месца сярод аказіянальных абрадаў займаюць абыдзённыя традыцыі, якія характарызуюцца тым, што абрадавы прадмет (нітка, тканіна, ручнік, хлеб), што павінен аказаць магічнае ўздзеянне на сітуацыю, павінен быць зроблены за абмежаваны час – за адзін дзень (або ноч). Абрады, якія дасягнулі неабходнага поспеху і выратавалі грамадства ад крызісу, маглі перайсці ў групу каляндарных і праводзіцца штогод у памяць пра станоўчае вырашэнне сітуацыі. Такім чынам, у

якасці асноўных функцый аказіянальных абрадаў можна вызначыць ахоўную і ачышчальную. Абарона і ачышчэнне сваёй тэрыторыі ад умяшання злых сілаў ажыццяўлялася пры дапамозе выкарыстання рытуальных прадметаў, тэкстаў, дзеянняў.

Уключэнне аказіянальнай абраднасці як асобнага кампанента беларускага абрадавага комплексу звязана з вызначэннем спецыфічных асаблівасцяў дадзенага тыпу (залежнасць формы, зместу і семантыкі абраду ад крызіснай сітуацыі, якая выклікала неабходнасць яго правядзення; вера ў эфектыўнасць яго правядзення; магічны характар аказіянальных абрадаў; ахоўная і ачышчальная функцыі іх правядзення; рухомасць працякання абрадавага часу; узаемасувязь і адметнаць кампанентаў аказіянальных абрадаў – славесных твораў, складу выканальнікаў, іх рытуальных дзеянняў, выбару месца для правядзення, выкарыстання матэрыяльных рэчаў і жывых істот). Пры гэтым неабходна адзначыць, што даследаванне аказіянальнай абраднасці мэтазгодна ў кантэксце этнафальклярыстыкі з улікам спецыфікі самой прыроды фальклора: у адзінстве “філалагічнага” і “этнаграфічнага” вывучэння [5, с. 123]. Аказіянальны абрад, як і іншыя фальклорныя факты, выступае адначасова з’явай народнага мастацтва і народнага быта [6, с. 17].

Важнае значэнне мае ўзаемасувязь аказіянальных з іншымі тыпамі беларускіх абрадаў і звычаяў, што відавочна ў знаходжанні элементаў, якія мелі сітуацыйны характар, у каляндарнай і сямейнай абраднасці, і наадварот. Гэта выяўляецца ў выкарыстанні адных рытуальных прадметаў, (напрыклад, ручніка) але з рознай семантыкай, падобнымі функцыямі галоўных удзельнікаў, выкананнем аднаго рытуалу ў складзе іншага (сімвалічны “пахавальны абрад” ахвяры) і г. д. Прыкладам такой узаемасувязі можа быць правядзенне некаторых аказіянальных абрадаў па абету, “такія абрады маглі ўзнаўляцца кожны год у памяць пазбаўлення ад няшчасця і, такім чынам пераходзілі на больш высокі ўзровень – уключаліся ў лік каляндарных рытуалаў” [7, с. 19]. Гэтыя працэсы маглі адбывацца і ў накірунку ўзаемапранікнення аказіянальных і сямейных абрадаў, калі ўзнікалі крызісныя сітуацыі, якія датычыліся асабістага жыцця. Існавала і адваротная сувязь. Каляндарныя або сямейныя абрадавыя дзеянні ў працэсе свайго гістарычнага развіцця маглі набываць сітуацыйны характар і выконвацца толькі пры ўзнікненні пэўнай неабходнасці.

Такім чынам, аказіянальная абраднасць з’яўляецца важным кампанентам беларускага абрадавага комплексу, які звязаны з рэакцыяй чалавека на тыя з’явы і падзеі, што парушалі звыклы ход яго жыцця і вызначаліся як крызісныя. Абрады і звычаі замацоўвалі і перадавалі наступным пакаленням дасягненні асабістага і грамадскага жыцця, яны з’яўляліся сродкам стабілізацыі і адлюстравання ў практыцы міжасабовых і грамадскіх адносін.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Цітавец, А. В. Кантэкстуальныя асновы вывучэння традыцыйнай славянскай абраднасці / А. В. Цітавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 4 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – С. 441-447.
2. Цітоў, В. С. Народная школа ў гісторыі нацыянальнай адукацыі / В. С. Цітоў // Народныя традыцыі і нацыянальная культура: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 6-7 снеж. 2001 г.: У 2 кн. / Пад рэд. В. С. Цітова. – Мінск : БДПУ, 2003. – Кн.2. – 122 с.
3. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Полымя, 2002. – 240 с.
4. Народная культура Беларусі : Энцыклапедычны даведнік / пад агул. рэд. В. С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
5. Ковалёва, Р. М. Интегративная фольклористика : учеб.-метод. пособие / Р. М. Ковалёва, О. В. Приемко. – Минск : БГУ, 2017. – 239 с.
6. Чистов, К. В. О взаимоотношении фольклористики и этнографии // Сов. этнография. – 1971. – № 5. – С. 17-24.
7. Байбурин, А. К. Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – Рос. АН, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.